УДК 37(476)(091)“16”

# АСВЕТНА-БАГАСЛОЎСКІ АСЯРОДАК ПРЫ СЛУЦКІМ ТРОІЦА-СЕРГІЕВЫМ МАНАСТЫРЫ Ў 1560–1580-я гг.

**Самусік Андрэй Фёдаравіч**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле аналізуецца гісторыя стварэння і дзейнасці школы пры Слуцкім Троіца-Сергіевым манастыры ў 1560–1580-я гг. Разгледжаны погляды яе рэктара Арцемія на пабудову вучэбна-выхаваўчага працэсу.*

З пачаткам праўлення ў ВКЛ Жыгімонта II Аўгуста ранейшыя ганенні на пратэстантаў былі прыпынены і распаўсюджванне іх абшчын па тэрыторыі Беларусі прыняло масавы характар. Прычым, разам з храмамі засноўваліся і школы, куды прымаліся ўсе жадаючыя з розных канфесій. Гэта вельмі непакоіла тую частку правячай эліты, якая захоўвала вернасць праваслаўю ці каталіцызму, бо змена веравызнання вучнёўскай моладдзю набыла пашыраны характар. Для спынення падобнай практыцы патрабавалася арганізацыя альтэрнатыўных пратэстанцкім навучальных устаноў, арыентаваных на забеспячэнне адукацыйных патрэб прадстаўнікоў іншых цячэнняў хрысціянства.

У праваслаўнай частцы айчыннага грамадства першым прадпрыняў адпаведныя захады стараста бабруйскі кн. Ю.Ю. Алелькавіч. У 1560 г. ён стаў гаспадаром Слуцка і арганізаваў у ім буйны асветна-багаслоўскі цэнтр, які дзейнічаў пры тутэйшым Троіца-Сергіевым манастыры. Яго ігуменам з’яўляўся Арцемій – уцекач з Расіі, дзе ён быў абвінавачаны ў ерасі ды лацінафільстве і засланы ў Салавецкі манастыр. У 1555 г. багаслоў збег адтуль “у Літву” – спачатку жыў у Віцебску, але хутка пераехаў у Слуцк [1, с. 48-49, 62-64].

Трэба адзначыць, што ў Расіі Арцемій лічыўся адукаваным чалавекам, які абараняў “книжное учение” ад нападак традыцыяналістаў. Згодна тагачасным разважанням багаслова толькі яно дае чалавеку дакладнае светаўспрыманне: “Никтоже бо с разумом родися когда, но учитися всякому словеси надлежит нужа. Любовь в божественных – любовь человеческих, от учениа бо разум прилагается, якоже в святых людех глаголется, еже и до смерти учитися подобает” [2, ст. 1437].

Не дзіўна таму і тое, што ўзначаленая ім школа ў Слуцку шырока славілася выкладаннем царкоўнаславянскай ды грэчаскай моў. Аднак, сам дух выкладання тут быў кансерватыўным, бо Арцемій лічыў прэваліруючым у вучэбна-выхаваўчым працэсе духоўнае ўдасканаленне розума. Паселіўшыся ў Беларусі ён істотна перагледзіў уласныя рэлігійна-філасофскія погляды ў бок праваслаўнай артадоксіі. Не выклікае сумненняў, што багаслоў неаднаразова



Электронный архив библиотеки МГПУ имени И.П. Шамякина Кулешова

сустракаўся тут з асобамі, атрымаўшымі адукацыю не толькі ў мясцовых каталіцкіх ды пратэстанцкіх школах, але і ў еўрапейскіх універсітэтах. Размовы з імі, напэўна, і прывялі Арцемія да пераканання пагрозы парушэння баланса паміж верай і ведамі, заснаванымі на "вызваленых навуках". Згодна яго разважанням менавіта апошнія паступова зачыняюць людзям доступ да разумення сапраўдных боскіх ісцін, найперш закладзеных у Св. Пісанні: "Разум же истинный, иже свидетельство имеет от божественных писаний, аще ли разум обрящется спротивен божественному писанию?" [2, ст. 1382].

Вынікам падобнай трансфармацыі светаўспрымання Арцемія стала тое, што ён пачаў выступаць рэзка супраць засваення "мірскіх навук". У "Пасланні да Сымона ерэтыка Буднага" (1564) ён адзначаў немагчымасць цалкам зразумець біблейскую мудрасць: "не выкладают бо ся отнюдь человеческим разумом божественная писаниа". Боскую ісціну здольны, згодна яго сцвярджэнню, усвядоміць толькі веруючы чалавек. Свецкія веды ў яго разуменні шкодны: "Мудрость мирская – вражда на Бога". Яны спрыяюць адыходу людзей ад шчырай веры ды сапраўднага пазнання Бога: "Се бо, обретаем многи научены во всех языцех напротив стоящих правыя веры и в нечестия и хулы и в различныя ереси уклоншихся. И ничтоже ползова их многое учение… По чистоте бо ума когождо разумевает божественная тайна учениа, а не человеческими науками. Очищает же ся ум сохранением Христовых заповедей и елико в них… толико просвещается… может бо истинное слово просветити и умудрити в благое правым сердцем без грамотикиа и риторикиа…" [2, ст. 1297, 1324-1325, 1342-1343].

Такі падыход Арцемія да свецкай адукацыі яўна не мог задаволіць у поўнай меры айчыннае праваслаўнае грамадства. Разам з тым, можна меркаваць, што з улікам ускладнення ў тагачасным ВКЛ рэлігійнага жыцця, шмат хто лічыў неабходным даць уласным дзецям спачатку належнае духоўнае выхаванне, а ўжо потым пераходзіць да засваення латыні, красамоўства і г.д. Так, вядома, што якраз у Слуцку першапачатковa вучыліся сыны гетмана вялікага ВКЛ, віленскага кашталяна Р.А. Хадкевіча: Андрэй (у будучым падстолі вялікі ВКЛ) і Аляксандр (у будучым староста гродзенскі ды магілёўскі). Наведвалі мясцовую школу яны да 1562 г., а далейшае навучанне юнакоў было даручана ўраджэнцу Цюрынгіі паэту-гуманісту Я. Мылію, які ў 1560-1561 гг. слухаў лекцыі ў Кракаўскай акадэміі і пасля яе заканчэння быў запрошаны ў Вільню на пасаду прыватнага працэптара. Верагодна, яго асноўнай задачай было падрыхтаваць сыноў гетмана да замежнай адукацыйнай паездкі, куды яны ўсе разам і адправіліся ў 1564 г. [3, с. 108, 110].

Азначаны варыянт спалучэння маральнага выхавання ў праваслаўным духу са свецкім па характару граматычна-рытарычным навучаннем знайшоў сваё далейшае ўвасабленне ў Астрожскай акадэміі і айчынных брацкіх школах. Арцемій, аднак, не лічыў магчымым іх звядзенне ў адзіную вучэбную праграму і да канца свайго жыцця імкнуўся пашырыць у ВКЛ кола асветна-багаслоўскіх асяродкаў, падобных на арганізаваны ім у Слуцку. Адпаведныя пасланні з заклікам спрыяць праз адкрыццё школ "духовному просвещению" праваслаўнага насельніцтва ён накіраваў старасце ўпіцкаму, скарбнаму ВКЛ І.С. Зарэцкаму, кн. І.Ф. Чартарыйскаму ды кн. А.М. Курбскаму [4, с. 72].

Пасля ж смерці Арцемія прыблізна ў 1575 г. рэктарам школы пры слуцкім Троіца-Сергіевым манастыры стаў яшчэ адзін маскоўскі эмігрант – знаўца



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

царкоўнаславянскай мовы М. Сарыгозін (Сарыхозін). Пры ім, магчыма, нейкім чынам супрацоўнічаў з гэтай навучальнай установай М. Стрыйкоўскі, які ў 1576-1578 гг. працаваў над "Хронікай" у мясцовым княскім кнігазборы і прысвяціў яе гаспадару Слуцка [5, с. 27-28]. Разам з тым, М. Сарыгозін хутка пакінуў Слуцк ды перабраўся ў маёнтак Мілянавічы пад Ковелям. У ім яшчэ адзін эмігрант з Расіі кн. А.М. Курбскі стварыў асветны гурток, члены якога выпраўлялі скажоныя рукапісы твораў "айцоў царквы", а таксама рабілі пераклады асобных тэкстаў з грэчаскай і лацінскай моў [6, с. 223-226].

Колькі існавала школа ў Слуцку дакладна невядома. Аднак, езуіт А. Пасевіна ў 1586 г. узгадваў яе сярод існуючых праваслаўных адукацыйных цэнтраў, адначасова прызнаючы значнасць для ўсёй канфесіі: "Некаторыя князі, як напрыклад, у Астрозе і Слуцку, маюць друкарні і школы, яны, як пуга для схізмы" [7, с. 24]. Асветная ж дзейнасць Арцемія ў далейшым стала ўзорам для пераймання. Выхаванец Львоўскай школы і адзін з заснавальнікаў Кіеўскага брацтва З. Капысценскі ў трактаце "Палінодыя" (1619-1622) пісаў аб ім наступным чынам: "Было теж и в России нашей дидаскалов много… не вспоминаючи старих, новых мяную пару якую: преподобного Артемия инока, который, споспешествующу ему Господу, в Литве от ереси Арианской и Лютеранской многих отвернул, и през него Бог справил, же ся весь народ Русский в Литве в ереси тыи не перевернул" [8, ст. 913].

## Літаратура


1. Занков, П. М. Старец Артемий, писатель XVI в. / П. М. Занков // Журнал Министерства народного просвещения. – 1887. – № 11. – С. 47-64.

2. Послания старца Артемия, XVI в. // Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической комиссией : в 39 т. – СПб ; Ленинград, 1872-1927. – Т. 4 : Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 1. – СПб. : Тип. А. Траншкля, 1878. – Ст. 1202-1448.

3. Кавалёў, С. В. Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу / С. В. Кавалёў. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – 376 с.

4. Зайцев, Д. М. Мировоззрение старца Артемия в контексте восточнославянских религиозно-философских взаимосвязей / Д. М. Зайцев // Вестник БНТУ. – 2004. – № 4. – С. 69-74.

5. Родчанка, Р. В. Слуцкая старасветчына : Факты і разважанні / Р. В. Родчанка. – Мінск : Полымя, 1991. – С. 27-28.

6. Сказания князя Курбского / под ред. Н. Г. Устрялова. – СПб. : Тип. Императорской Академии наук, 1868. – 494 с.

7. Possevini, A. Moscovia / A. Possevini. – Vilnae : Apud I. Velicensem, 1586. – P. 24.

8. Палинодия. Сочинение Киевского иеромонаха Захария Копыстенского, 1621-1622 года // Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической комиссией : в 39 т. – СПб ; Ленинград, 1872-1927. – Т. 4 : Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 1. – СПб. : Тип. А. Траншкля, 1878. – Ст. 313-1200.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова